**Maryna Ignatowicz**
*Grodzieńska Obwodowa Biblioteka Naukowa im. E. F. Karskiego*

# ЭЛІЗА АЖЭШКА Ў ПАМЯЦІ НАШЧАДКАЎ: РАБОТА ДЗЯРЖАЎНАЙ УСТАНОВЫ КУЛЬТУРЫ „ГРОДЗЕНСКАЯ АБЛАСНАЯ НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ Я.Ф.КАРСКАГА" ПА ЎШАНАВАННІ ПАМЯЦІ ПІСЬМЕННІЦЫ

Імя Элізы Ажэшкі, як і знакаміты Дом пісьменніцы з'яўляецца своеасаблівым брэндам для дзяржаўнай установы культуры „Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага". Калектыў галоўнай бібліятэкі вобласці з гонарам і годнасцю ўшаноўвае памяць аб славутай пісьменніцы і працягвае яе традыцыі.

Так ужо гістарычна склалася, што больш чым паўстагоддзя месца, дзе жыла пані Эліза, сустракалася з рознымі людзьмі, праводзіла дабрачынныя вечары-канцэрты і іншыя мерапрыемствы, знаходзіцца на балансе абласной бібліятэкі.

Дом гэты належаў адвакату Станіславу Нагорскаму, які стаў другім мужам пісьменніцы ў 1894 годзе. Пасля працяглага рамонту і добраўпарадкавання дома Э. Ажэшка пераязджае сюды восенню 1895 г. З таго часу будынак на вуліцы Садовай вядомы як „шэры дворык" Элізы Ажэшкі.

Дакладнае апісанне інтэр'ера дома дае ў сваіх успамінах часты госць пісьменніцы Францішак Гадлеўскі:

„Кватэра была абстаўлена сціпла... Мэбля сучасная, абцягнутая пераважна блакітным плюшам. У малым салоніку знаходзіўся мармуровы камін, над ім – люстэрка.

Сцены ўпрыгожвалі „Анастазія" А. Каменскага, карціны „Бараны" і „Дзве сястры" невядомага аўтара, прыгожы партрэт пані Паўлоўскай, некалькі малюнкаў, мініяцюр і фотаздымкаў.

Шафы былі перапоўнены кнігамі на розных мовах, што разам складала кнігазбор… Кватэру ажыўлялі на працягу года свежыя кветкі (белы бэз, цыкламены і азаліі), а таксама букеты сезонных кветак…”. 1

У гэтым доме Эліза Ажэшка жыла да канца сваіх дзён.

Пасля смерці пісьменніцы (1910 г.) дом у 1911 г. быў перададзены Гродзенскаму таварыству апекі над дзецьмі. У 1920-я гг. тут знаходзілася гандлёвая школа.

У 1940 г. у доме Э. Ажэшкі адкрылася дзяржаўная музычная школа і знаходзіліся выбарчыя акругі №№585 і 600 па выбарах у Вярхоўны Савет СССР.

Пасля вызвалення горада ад фашысцкіх акупантаў у доме размяшчаліся ўпраўленне аблпраекта, станцыя пералівання крыві і інвентарызацыйна-тэхнічнае бюро.

6 студзеня 1948 г. Гродзенскі гарвыканкам прымае рашэнне аб перадачы дома Э. Ажэшкі Дзяржаўнаму гісторыка-археалагічнаму музею як філіял прыродазнаўчага музея. У маі 1949 г. новым рашэннем дом пісьменніцы перадаецца ГАРАНА для арганізацыі ў ім Дома піянераў, які размяшчаўся тут аж да 1954 г.

У 1958 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё мемарыяльнай дошкі памяці Э. Ажэшкі, ў 1959 г., згодна з рашэннем Міністэрства культуры БССР, была адкрыта чытальная зала імя Элізы Ажэшкі, у 1964 г. у доме Э. Ажэшкі была адкрыта бібліятэка: спачатку ў 1965 г. – юнацкі філіял, а ў 1966 г. – аддзел выданняў на замежных мовах, тут жа з 1982 да 2001 г. размяшчаўся аддзел мастацтва; з 1965 да 2000 г. – Гродзенскае аддзяленне Саюза пісьменнікаў.

Намаганнямі супрацоўнікаў бібліятэкі (1967 г.) у гэтым доме была створана экспазіцыя, прысвечаная жыццю і творчасці Э. Ажэшкі, якая ўключала: фотаздымкі, карціны, рэпрадукцыі, 3 аркушы гербарыя, створанага Элізай Ажэшка, кнігі., у тым ліку з асабістай бібліятэкі пісьменніцы.

У 1976 г. у працэсе рэканструкцыі будынка з сілікатных блокаў склалі копію дома, якую размясцілі далей ад праезджай часткі, а арыгінальны будынак разбурылі. Пасля капітальнага рамонту і яго мадэрнізацыі (2008–2009 гг.) адкрыўся інфармацыйна-адукацыйны цэнтр абласной бібліятэкі. Створаны належныя ўмовы для павышэння адукацыйнага ўзроўню, развіцця інтэлекту, таленту і творчых здольнасцяў падлеткаў і моладзі.

Памяць пра Элізу Ажэшку жыла і жыве ў сэрцах нашых сучаснікаў. Супрацоўнікі Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя

Я.Ф.Карскага распрацавалі творчы праект „Эліза Ажэшка ў памяці нашчадкаў", накіраваны на ўшанаванне памяці пра нашую вялікую зямлячку.

15 гадоў таму, а менавіта 18 чэрвеня 2001 г., на падставе рашэння Гродзенскага аблвыканкама адбылося ўрачыстае адкрыццё мемарыяльнага пакоя, прысвечанага жыццю і творчасці Э. Ажэшкі. Дапамогу ў яго арганізацыі і папаўненні экспанатамі аказвалі арганізацыі, установы і грамадскасць горада Гродна, у тым ліку Генеральнае консульства Рэспублікі Польшча ў Гродне, Саюз палякаў на Беларусі, Суд Кастрычніцкага раёна г. Гродна і інш.

Ад часу жыцця пісьменніцы ў доме захаваліся: мармуровы камін, драўляны тамбур, упрыгожаны разьбой, балконны бар'ер. Асаблівую каштоўнасць уяўляюць прыжыццёвыя выданні твораў пісьменніцы на польскай і рускай мовах.

Тут, у пакоях, як і пры жыцці Э. Ажэшкі, на кніжных паліцах – кнігі, на сценах – карціны; фотаздымкі, гербарый, стол, крэслы, дываны – усё аформлена так, каб максімальна перадаць гістарычны каларыт эпохі і захаваць непаўторную аўру гэтага месца.

З часу адкрыцця мемарыяльнага пакоя яго наведалі звыш 45 тыс. гарадзенцаў і гасцей нашага горада. Сярод іх і вельмі ганаровыя госці – прадстаўнікі дыпламатычных місій у Беларусі (Польшчы, ЗША, Францыі, Грэцыі і інш.), вучоныя розных краін, творцы, і моладзь.

Супрацоўнікі бібліятэкі праводзяць экскурсіі як індывідуальныя, так і для груп на беларускай, рускай, польскай і англійскай мовах. Акрамя таго, распрацаваныя і праводзяцца тэматычныя экскурсіі: „Сямейныя карані і традыцыі Э. Ажэшкі", „Дабрачынная дзейнасць Э. Ажэшкі", „Асаблівасці творчасці пісьменніцы".

Хацелася б адзначыць, што ў гэтым доме захоўваюцца не толькі музейныя экспанаты, але і традыцыі Э. Ажэшкі. Пры жыцці пані Элізы гэты дом наведвалі знакамітыя асобы, вучоныя і грамадскія дзеячы, а ў „Вялікім салоне" праводзіліся творчыя сустрэчы з пісьменнікамі, мастакамі і іншымі прадстаўнікамі інтэлігенцыі, з моладдзю.

У працяг гэтай традыцыі з 2002 г. пры бібліятэцы створаны і дзейнічае літаратурна-музычны салон „У пані Элізы", пасяджэнні якога прысвячаюцца жыццю і творчасці Э. Ажэшкі („Легенды і паданні ў творчасці Э. Ажэшкі", „Гэты дом даражэй з гадамі", „Ажэшка і яе акружэнне"), а таксама знакамітым дзеячам культуры, літаратуры і мастацтва Гродзеншчыны, як прыклад, „Чалавек легендарнай біяграфіі: Аляксей Карпюк", „Ю. Ядкоўскі і Гародня" і г.д.

З мэтай ушанавання памяці пісьменніцы калектыў бібліятэкі арганізоўваў і праводзіў міжнародныя навукова-практычныя канферэнцыі (1995–1997 гг., 2011 г.). У 2004 годзе ладзіліся Першыя Міжнародныя Ажэшкаўскія чытанні. Хочацца спадзявацца, што і гэта традыцыя захаваецца.

Яшчэ адно добрае і шчырае пачынанне пані Элізы адноўлена дзякуючы намаганням супрацоўнікаў нашай установы. Эліза Ажэшка вельмі любіла дзяцей, якія гарнуліся да яе, як да сонейка, асабліва абяздоленыя, беспрытульныя, сіроты. У яе доме быў створаны цэлы дзіцячы пансіён, пераважна для дзяўчынак. Штогод на Каляды гаспадыня наладжвала свята вакол ёлкі для дзяцей з бедных сем'яў. Іграла музыка, гарэлі зіхоткія бенгальскія агні. У канцы вечара Э. Ажэшка надзяляла ўсіх падарункамі. Вось ужо больш 10 гадоў напярэдадні свята Новага года цішыня дома, у якім жыла пісьменніца, перапыняецца дзіцячымі галасамі. Выхаванцы Панямунскага дзіцячага дома, Дома змешанага тыпу г.Гродна і Лойкаўскага сацыяльнага прытулку (штогод звыш 100 чалавек) прыходзяць на сустрэчу ў гэты цёплы для іх сэрцаў дом. У 2015 годзе мы запрашалі і дзяцей з сем'яў перасяленцаў з Украіны.

Работнікі бібліятэкі ладзяць свята: апранаюцца ў касцюмы казачных герояў, арганізуюць навагодняе прадстаўленне. Канешне ж, любое свята не абыходзіцца без падарункаў, і гэта не толькі салодкія пачастункі, але адзенне і абутак. Супрацоўнікамі бібліятэкі праводзіцца вялікая работа па пошуку спонсарскай дапамогі. Каталіцкае і праваслаўнае духавенства, а таксама прадпрыемствы і арганізаыі г.Гродна ахвотна адклікаюцца на нашу просьбу. Не застаюцца ў баку і чытачы абласной бібліятэкі, якія падчас дабрачыннай акцыі таксама прыносяць патрэбныя дзецям рэчы: алоўкі, цацкі, кнігі і г.д. Не магу не ўспомніць самыя яскравыя моманты, сярод якіх – сумеснае правядзенне з галоўным упраўленнем ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама і гісторыка-культурным праектам „Жывая гісторыя", з установай адукацыі „Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы"– акцыі „Каляды ў Э. Ажэшкі", у межах якой у 2012 г. быў праведзены першы ў Гродне аўкцыён прадметаў мастацтва. Удзел у ім прынялі мастакі і скульптары г.Гродна са сваімі работамі, а таксама прадстаўнікі прадпрыемстваў г.Гродна. Было сабрана амаль 50 млн. руб. на набыццё падарункаў дзецям-сіротам і інвалідам. Мы імкнуліся выканаць пажаданні дзяцей, бо ім было прапанавана напісаць пісьмы Дзеду Марозу.

У 2014 годзе дзеці-сіроты выступалі ў якасці мадэляў падчас дабрачыннага вечара паказу моды. Юныя выхаванцы дзіцячых дамоў дэманстравалі адзенне і абутак гродзенскіх прадпрыемстваў. Для гэтых хлопчыкаў і дзяўчынак вялікім неспадзяваннем і шчасцем было атрымаць прыгожыя і патрэбныя рэчы ў падарунак.

Ушанаванню памяці пісьменніцы садзейнічае і правядзенне на пачатку чэрвеня гарадскіх святаў у „Швейцарскай даліне", размешчанай каля дома Э.Ажэшкі. Кожны раз мы стараліся здзіўляць гарадзенцаў: ладзілі літаратурнае свята „Эліза Ажэшка запрашае" (2013 г.), дзе можна было знайсці занятак на свой густ як дарослым, так і дзецям; арганізавалі „Гістарычную вандроўку па вуліцы Э. Ажэшкі" (2014 г.) і тэатралізаванае прадстаўленне, на якім гарадзенцы змаглі перанесціся ў эпоху канца XIX – пачатку XX стст. Атмасферу далёкага мінулага стваралі і прыгожая гандлярка з букецікамі палявых кветак, і паштальён, які прапаноўваў пазнаёміцца з „Бібліятэчнымі навінамі", і чысцільшчык абутку, і швачка і інш.

Каля дома разгарнуўся сапраўдны рамесны квартал, дзе майстры прапаноўвалі свае вырабы, а каля цэнтральнага ўвахода размясціўся імправізаваны салон „У пані Элізы". Акрамя таго, усе жадаючыя маглі даведацца пра гісторыю кожнага дома, размешчанага на вуліцы Э. Ажэшкі, наведаць фотамайстэрню і невялікае кафэ „Гарбата ад пані Элізы".

Праводзячы свята ў „Швейцарскай" даліне „Эліза Ажэшка і яе акружэнне" ў 2015 г., мы пашырылі кола галоўных герояў прадстаўнікамі беларускай культуры: Ф. Багушэвічам, Цёткай і М. Багдановічам. Усе жадаючыя маглі навучыцца тагачасным танцам ці ствараць гербарый (адзін з любімых заняткаў Э. Ажэшкі). На працягу мінулага лета штотыднёва каля Дома пісьменніцы ў „Швейцарскай" даліне ладзілася літаратурна-гульнёвая праграма „Бібліятэка пад адкрытым небам". І юныя гродзенцы мелі гонар атрымаць білет чытача ці кнігу ад самой пані „Элізы Ажэшкі".

Салон „У пані Элізы" стаў таксама ўпрыгожаннем рэспубліканскага свята – Дня беларускага пісьменства ў Шчучыне (2015 г.).

Канешне ж, знакавы для нашай установы і 2016 год – юбілейны, 175 гадоў з дня нараджання сусветна вядомай пісьменніцы. Асноўны акцэнт мы зрабілі на чэрвень: правялі Міжнародныя Ажэшкаўскія чытанні, гарадскі конкурс мультымедыйных рэсурсаў „У гонар таленавітай зямлячкі", свята для дзяцей-сірот, „Чыталі разам" (прадстаўнікі ўлады, творчай інтэлігенцыі, моладзь, школьнікі) творы пісьменніцы падчас абласной акцыі і інш.

Не абмінаем мы і так папулярную на сённяшні дзень віртуальную прастору. На сайце нашай бібліятэкі размешчана „Віртуальнае падарожжа па Дому Э. Ажэшкі", дзякуючы чаму людзі з розных куткоў свету могуць пазнаёміцца з музейнай экспазіцыяй, прысвечанай пісьменніцы.

Супрацоўнікамі абласной бібліятэкі падрыхтаваны і выдадзены тыпаграфскім спосабам на чатырох мовах (беларускай, польскай, рускай і англійскай) буклет „Домік Элізы Ажэшкі", які карыстаецца папулярнасцю сярод турыстаў.

Такім чынам, жыццё ў Доме Элізы Ажэшкі віруе… Мы не спыняемся, прыдумваем, арганізуем і праводзім цікавыя імпрэзы, дабрачынныя акцыі; робім усё магчымае – каб памяць пра Элізу Ажэшку жыла ў сэрцы кожнага гарадзенца.

**Бібліяграфія**

*Godlewski, F.* Pani Orzeszkowa : Wspomnienia. – Warszawa : Dom Książki Polskiej, 1934. – S. 23.

Біяграфія гарадзенскіх вуліц: ад Фартоў да Каложы / аўтары: А. Вашкевіч, А. Госцеў, В. Саяпін, І. Трусаў, А. Чарнякевіч, Я. Лялевіч, І. Лапеха. – Гародня : Wrocław, 2012. – 369 с. – (Гарадзенская бібліятэка).

Галоўная кніжніца Прынямоння : да 180-годдзя з дня заснавання ДУК „Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага" / склад.: Л. В. Мальцава і інш. – Гродна, 2010. – 119 с.

Домік Элізы Ажэшкі / ДУК „Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага". – Гродна, 2011. – 31с.

Саяпин, В. Ю. Пешком по Ожешко и Советской / Виктор Саяпин. – Гродно : ЮрСаПринт, 2011. – 103, [1] с. – (Hrono Гродно).

**Maryna Ignatowicz**
*Karsky Scientific Library in Grodno*

## ELIZA ORZESZKOWA IN THE MEMORY OF FUTURE GENERATIONS: ACTIVITIES OF THE NATIONAL CULTURE INSTITUTE – THE "KARSKY SCIENTIFIC LIBRARY" IN GRODNO – FOR PRESERVING THE MEMORY OF ELIZA ORZESZKOWA

### Summary

The article presents the experiences of the Karsky Scientific Library in Grodno in preserving the memory of the writer of world-famous Eliza Orzeszkowa. From 1964, E. Orzeszkowa's house, in which she lived from 1894 to 1910, has been under the care of the regional library. The institution's employees restored the traditions of the writer: a memorial room dedicated to Orzeszkowa's life and work was opened, a music and literary salon "U Pani Elizy" [At Eliza's], a booklet "Eliza Orzeszkowa's House" in Belarusian, Russian, Polish and English was published, annual charity Christmas parties trees for orphans have been organized, events held during the city celebrations, in which the residents and guests of Grodno take part.

**Keywords**: Grodno, Eliza Orzeszkowa, house of Eliza Orzeszkowa, regional library, monument of peace and tradition.

**Maryna Ignatowicz**
*Grodzieńska Obwodowa Biblioteka Naukowa im. E. F. Karskiego*

## ELIZA ORZESZKOWA W PAMIĘCI PRZYSZŁYCH POKOLEŃ: DZIAŁANIA PAŃSTWOWEJ INSTYTUCJI KULTURY „GRODZIEŃSKA OBWODOWA BIBLIOTEKA NAUKOWA IM. E.F.KARSKIEGO" W KWESTII UTRWALENIA PAMIĘCI PISARKI

### Streszczenie

W artykule przedstawiono doświadczenia zespołu Grodzieńskiej Obwodowej Biblioteki Naukowej im. E. F. Karskiego w kwestii utrwalenia pamięci pisarki o światowej sławie: Elizy Orzeszkowej. Od 1964 roku Dom E. Orzesz-

kowej, w którym mieszkała ona od 1894 do 1910 r., jest pod opieką biblioteki obwodowej. Pracownicy instytucji przywrócili tradycje pisarki: otwarto pokój pamiątkowy poświęcony życiu i twórczości Orzeszkowej, działa salon muzyczno-literacki „U Pani Elizy", wydano broszurę *Domek Elizy Orzeszkowej* w językach białoruskim, rosyjskim, polskim i angielskim, corocznie organizowane są charytatywne choinki dla dzieci-sierot, przeprowadzane są imprezy podczas świąt miasta, w których udział biorą mieszkańcy i goście Grodna.

**Słowa kluczowe**: Grodno, Eliza Orzeszkowa, dom Elizy Orzeszkowej, biblioteka obwodowa, pomnik pokoju i tradycji.